# ЭКАНОМІКА АРЫЕНТУЕЦЦА НА СУВЯЗІ І ДАВЕР

## Кіраўнік дзяржавы сустрэўся са спікерам парламента Грузіі

**Асноўная тэма сустрэчы — супрацоўніцтва дзвюх краін, а таксама візіт Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі ў першай палове наступнага года ў Тбілісі. Іраклій Кабахідзэ, старшыня парламента Грузіі, адзначыў, што ў аснове двухбаковых адносін — нават не столькі палітычныя і дыпламатычныя адносіны, колькі сяброўства беларускага і грузінскага народаў.**

Тыдзень таму гэтыя тэмы ўжо абмяркоўваліся ў Палацы Незалежнасці — падчас сустрэчы беларускага лідара і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Грузіі ў Беларусі Давіда Катарыі.

— Ваш візіт якраз упісваецца ў мае нядаўнія сустрэчы з прадстаўнікамі Грузіі, — мяркуе Аляксандр Лукашэнка. — Усе гэтыя сустрэчы, безумоўна, мы накіроўваем на афіцыйны візіт беларускага Прэзідэнта да вас у Грузію ў першай палове наступнага года. Мы пра гэта дамовіліся. Мы вельмі актыўна працуем разам з вамі па напаўненні гэтага візіту, каб застаўся след перш за ўсё ў эканоміцы, у гандлі паміж нашымі дзяржавамі.

Так, на думку нашага Прэзідэнта, тая мэта, якую мы для сябе вызначылі — а гэта дасягненне ўзроўню тавараабароту ў 200 мільёнаў долараў паміж дзвюма краінамі, — цалкам рэальная.

— Палову прыкладна мы будзем мець сёлета, — падлічыў Аляксандр Лукашэнка. — Але, безумоўна, трэба сур'ёзна працаваць. Зусім нядаўна наша ўрадавая дэлегацыя была ў вас. Адбылося пасяджэнне сумеснай міжурадавай камісіі, дзе мы вызначаліся накont далейшых крокаў у адносінах паміж Грузіяй і Беларуссю.

Што да палітычных адносін, то Прэзідэнт адзначыў: ён удзячны Грузіі, што, нягледзячы на розніцу ў арыенцірах краіны «цалкам па-брацку» паводзяць сябе ў адносінах адна да адной.

— Я ў палітыцы не першы год і ведаю, чаго гэта каштуе Грузіі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Але вы заўсёды шчыра і адкрыта яшчэ з часоў Міхаіла Саакашвілі падтрымлівалі Беларусь. Мяне спачатку здзіўляла пазіцыя Міхаіла, таму што, зразумела, у яго арыентацыя жорсткая была на Захад, на Амерыку. І калі ўсе былі супраць Беларусі настроены, ён заўсёды адкрыта казаў пра Беларусь толькі цёплыя, добрыя словы ў адносінах да нашага народа і нават беларускага Прэзідэнта, хоць гэта было непапулярна.

Цяперашняе ж кіраўніцтва Грузіі, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, ужо комплексна, мэтанакіравана, ні ад каго не хаваючыся выбудоўвае адносіны з Беларуссю:

— Сёння часы памяняліся, але гэта перамена і паляпшэнне нашых адносін з Захадам, з Амерыкай у многім заслуга Грузіі. Мы вам за гэта вельмі ўдзячныя, і вось з тых часоў у нас няма нейкіх адрозненняў у разуменні палітычных працэсаў. Парадак дня і ацэнка гэтага міжнароднага парадку дня ў нас цалкам супадае.

Больш за тое, і Беларусь, і Грузія заўсёды гатовы дапамагчы адна адной.

— Я, на жаль, нават не ведаю: вы нам перадалі лекі для лячэння хворых на велізарную суму, — прывёў прыклад беларускі лідар. — Мы вам дапамагалі ў цяжкія часы, калі загарэўся рэліктавы лес. Гэта для нас, асабліва для мяне, таксама балюча. Як толькі паступіў першы званок, да вечара ў вас быў верталёт. Я праінструктаваў асабіста пілотаў, каб яны проста шчыра выканалі свой абавязак. І яны, як мне пасля ўжо сказалі, працавалі дзень і ноч, але зрабілі годны ўнёсак у пераадоленне гэтай катастрофы.

Па словах нашага Прэзідэнта, ва ўзаемаадносінах дзвюх краін ёсць шмат такіх эпізодаў. Яны сведчаць пра даверальную атмасферу, якая выбудоўваецца. У гэтым плане вельмі важны візіт парламенцкай дэлегацыі:

— Мы вельмі важнае значэнне надаём парламенцкаму вымярэнню. І я ўдзячны вам, што вы наведваеце Беларусь. Вельмі хацеў бы, каб вы пазнаёміліся з нашай краінай — хоць бы па асобных прадпрыемствах, але па сектарах.

Такім чынам, акцэнт — на прадметнае супрацоўніцтва. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў дэлегацыі паглядзець як сельгаспрадпрыемствы «сярэдняй рукі», так і ўзорныя, на якія арыентуемся. А нашы прамысловыя прадпрыемствы ўжо пачалі выпускаць спецыяльную адаптаваную да грузінскіх умоў тэхніку:

— Мы нават на заводах сельгастэхнікі спецыяльна для Грузіі робім глебаапрацоўчую тэхніку. Трактарны завод пачаў выпускаць малыя і сярэднія трактары, спецыяльна адаптаваныя пад Грузію. Паглядзіце, калі будзе час, наш аўтамабільны сектар. Мы нядаўна пабудавалі завод разам з нашымі кітайскімі партнёрамі па вытворчасці легкавых аўтамабіляў — гэта першы легкавы аўтамабіль — вельмі добры, дастойны атрымаўся, на самым высокім узроўні.

Акрамя гэтага, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў грузінскай дэлегацыі азнаёміцца з прадпрыемствамі дрэваапрацоўкі, калійнымі камбінатамі...

— Мы нічога ад вас не хаваем. Хочаце прадпрыемствы ВПК, калі ласка, мы вам пакажам ваенную тэхніку, якую выпускаем, — паабяцаў беларускі лідар.

Іраклій Кабахідзэ падзякаваў за цёплы прыём і за асабісты ўнёсак беларускага лідара ў развіццё беларуска-грузінскіх адносін. «У нас цудоўныя адносіны і дынаміка вельмі інтэнсіўная. Мы павінны зрабіць як палітыкі ўсё, каб і надалей умацаваць сяброўства паміж нашымі народамі», — адзначыў грузінскі спікер.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ПАРАДАК І СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

## Кіраўнік дзяржавы прыняў кадравыя рашэнні

**Яны датычыліся сілавой структуры. На пасаду начальніка 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Узброеных Сіл назначаны Уладзіслаў Будзік. Звяртаючыся да яго, Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў трагедыю, што адбылася ў гэтай вайсковай часці — у Печах.**

Ён згадаў ранейшае правіла — хлопца, калі ён быў адзіным дзіцем у сям'і, маглі не прызываць у армію. На думку кіраўніка краіны, гэтую практыку трэба прагледзець і праналізаваць. З іншага боку, трэба ўлічваць і жаданне самога маладога чалавека, яго сям'і.

— Многія бацькі з задавальненнем адпраўлялі і адпраўляюць дзяцей ва Узброеныя Сілы, таму што гэта добрая школа. У мяне дзеці служылі ў спецпадраздзяленнях, як належыць. Яны прайшлі праз гэта, — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

— Тое, што адбылося ў вашай часці, — гэта катастрофа, — заявіў Прэзідэнт. — Я не перабольшваю. Усякае ў арміі бывае, але ў беларускай арміі — гэта катастрофа, таму што мы заўсёды ганарыліся, што ў нас адсутнічае дзедаўшчына. Яно сапраўды так. Я далёкі ад таго, каб гэтая пляма легла на ўсю армію, як там некаторыя нашы апаненты пaпісваюць у інтэрнэце. Гэта армія. Зразумела, што гэта асаблівая, суровая служба, і яна заўсёды будзе такой. Але дзедаўшчына непрымальная.

Як прызнаўся Аляксандр Лукашэнка, ён вельмі балюча рэагуе на падобныя выпадкі. У нашай арміі дзедаўшчыне не месца. Кіраўнік краіны прывёў у прыклад структуру Міністэрства ўнутраных спраў, дзе падобныя выпадкі не адзначаюцца.

— Адносіны павінны быць чалавечымі. Не трэба баяцца лішні раз, каб бацькі прыехалі, асабліва ў гэты перыяд, калі яны (*навабранцы*. — **Аўт.**) знаходзяцца ў «вучэбцы». Можа быць, нават часцей іх адпускаць. Што здарыцца, калі ён раз на месяц на дзень-два паедзе дома пабудзе? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў пра сваё даручэнне абавязкова дапусціць маці загінулага ваеннаслужачага Святлану Коржыч да следчых мерапрыемстваў.

— Калі яна хоча камусьці задаць пытанне, хай задасць, — агучыў сваё патрабаванне Прэзідэнт. — Хаваць не трэба, як бы там сітуацыя ні разгортвалася. І я вас перасцерагаю ад заўчасных высноў. Усё павінна быць сумленна. І маці ўвогуле малайчына. Абсалютна адэкватны, разумеючы чалавек. Не ведаю, як бы я на гэта рэагаваў. Крый божа камусьці гэта перажыць. Але яна майму прадстаўніку казала: «Я не хачу, каб нехта быў пакараны несправядліва». Зразумела, калі мы несправядліва кагосьці пакараем, мы пародзім яшчэ адну праблему: пакрыўдзім чалавека, які не здзейсніў гэтага злачынства. Таму яна павінна быць дапушчана да следчых дзеянняў. Хай гэта ў законе не прадугледжана, не важна. Гэта надзвычайны выпадак, гэта маё асабістае рашэнне.

Маці загінулага цалкам павінна быць у курсе справы — які б ні быў вынік расследавання. Раней кіраўнік дзяржавы даручаў генеральнаму пракурору Аляксандру Канюку і старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерыю Вакульчыку сустрэцца са Святланай Коржыч.

Галоўны ж пасыл: такое ў нашай арміі больш не павінна паўтарыцца. Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што Уладзіслаў Будзік зможа навесці парадак у Печах.

— Я выберу час і пабуду ў вас там. Можа, гэта і мая віна, што я, будучы галоўнакамандуючым, у гэтай галоўнай нашай часці не пабываў. Але я ў вас пабуду абавязкова, — паабяцаў кіраўнік дзяржавы.

* * *

На пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама назначаны Сяргей Дарошка.

Сталіца — сфера асаблівай адказнасці.

— Гэта горад, гэта сталіца. Мы не можам згубіць свой твар. Мы заўсёды ганарымся тым, што ў нас Мінск — гэта прыгажун-горад, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але самае галоўнае, што жанчына ў любы час дзіця пасадзіла ў каляску і пайшла па вуліцы — і да яе ніхто не мае права дакрануцца.

Добрая практыка, упэўнены кіраўнік дзяржавы, калі маладыя вайскоўцы патрулююць вуліцы:

— Гэта дэманстрацыя насельніцтву, што ў нас парадак. І вайскоўцам трэба гэтаму вучыцца, калі яны патрулююць горад, — спакойна, ціха. Яны будуць разумець, што патрэбныя людзям, а людзі, гледзячы на іх, будуць разумець, што ў горадзе спакойна. Гэта трэба вітаць. Гэта ж не мы нешта выдумляем.

Сапраўды, падобная практыка была ў савецкія часы.

Што да розпага кшталту беспарадкаў, спроб дэстабілізаваць абстаноўку, то тут, упэўнены кіраўнік краіны, дзеянні міліцыі павінны быць рашучыя.

— У вас павінна быць самая жорсткая палітыка, да двух лічыць вы не павінны, — звярнуўся кіраўнік нашай дзяржавы да Сяргея Дарошкі. — Вы бачыце, што вакол адбываецца. Калі мы тут аслабім патрабаванні да бяспекі нашых людзей, захліснe нас імгненна, прытым з усіх бакоў. Ідучы на гэтую працу, вы павінны выразна разумець, што вы пад кантролем не толькі ў свайго начальніка. Вы заўсёды павінны адчуваць навата ў спіну мой погляд, таму што я буду ўвагу на ўсе пытанні: ад паставога міліцыянера, які забяспечвае праезд картэжу, да дзяжурства вашых хлопцаў у горадзе. Таму і хачу, каб ніхто потым камень у ваш бок не кінуў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Прэзідэнт Зімбабвэ пагадзіўся пайсці ў адстаўку



Роберт Мугабэ пагадзіўся з умовамі сыходу ў адстаўку, ужо падрыхтаваны чарнавік адпаведнай заявы, перадае тэлеканал i24 News Africa. Па словах крыніцы, інфармаванай аб ходзе перагавораў, прадстаўнікі войска краіны пагадзіліся на многія патрабаванні Мугабэ, уключаючы поўны імунітэт для яго і яго жонкі Грэйс, а таксама захаванне прыватнай уласнасці. Суразмоўнік тэлеканала дадаў, што галоўнай мэтай прадстаўнікоў арміі было прымусіць Мугабэ ў ходзе нядзельнага выступу абвясціць канстытуцыйнымі дзеяннi вайскоўцаў. Як паведаміла крыніца, каб адстаўка адбылася, заява павінна быць у першую чаргу накіравана спікеру парламента. Мугабэ ў нядзелю падчас звароту да нацыі не стаў расказваць пра свой сыход і заявіў, што збіраецца старшынстваваць на кангрэсе кіруючай партыі ў снежні. «Мугабэ зацягвае працэс, спрабуючы знайсці дастойны выхад на сваіх умовах», — прыводзіць агенцтва Bloomberg словы аналітыка інстытута дэмакратыі Зімбабвэ Рашвета Мукунду.

## Перагаворы па фарміраванні новага ўрада ФРГ праваліліся

Ліберальная Свабодная дэмакратычная партыя Германіі (СДП), якая ўдзельнічала ў перагаворах з хрысціянскімі дэмакратамі канцлера Ангелы Меркель і «зялёнымі», адмовілася іх працягнуць. Лідар «свабодных дэмакратаў» Крысціян Ліндэр растлумачыў выхад сваёй партыі з працэсу «адсутнасцю асновы даверу падчас фарміравання кааліцыі. Па выніках выбараў у Бундэстаг, якія прайшлі 24 верасня, склалася сітуацыя, у якой кааліцыя пад назвай «Ямайка» (у складзе ХДС/ХСС, «зялёных» і СДП — па колерах, што сімвалізуюць партыі) засталася адзіным варыянтам аб'яднання палітычных сіл. Услед за лібераламі ад удзелу ў фарміраванні кааліцыі адмовілiся таксама сацыял-дэмакраты, а затым і «зялёныя». Як заўважаюць аналітыкі, найбольш імаверным варыянтам развіцця падзей уяўляюцца перавыбары ў Бундэстаг, якія ні разу не праводзіліся за ўсю пасляваенную гісторыю Германіі.

## Кожная брытанская сям'я губляе каля $530 у год з-за брэксіту

Брытанскія сем'і губляюць у сярэднім па 404 фунты стэрлінгаў ($534) у год пасля правядзення рэферэндуму аб выхадзе краіны з Еўрасаюза (Brexit). Пра гэта паведаміў у апублікаваным даследаванні Цэнтр эканамічных паказчыкаў Лонданскай школы эканомікі. Па падліках спецыялістаў цэнтра, з-за росту цэн сярэднестатыстычны работнік за год губляе суму, роўную тыднёвай аплаце працы. Пры гэтым найбольшы рост цэн назіраецца на групы тавараў з высокай доляй імпарту: хлеб і крупы, малочныя прадукты, кава, гарбата, какава, віно, піва, мэбля, ювелірныя ўпрыгажэнні і гадзіннікі. Ад росту ўзроўню інфляцыі больш за ўсё пацярпелі Шатландыя, Уэльс і Паўночная Ірландыя, найменш закрануты ростам цэн Лондан.

## Налета прагназуецца рост колькасці разбуральных землятрусаў



Ледзь не двухразовы рост землятрусаў чакаецца на Зямлі пачынаючы з 2018 года. Да такіх высноў прыйшоў геафізік Роджэр Білхэм з Універсітэта Каларада ў Боўлдэры, вывучыўшы статыстыку землятрусаў магнітудай звыш 7 з 1900 года. Шматгадовыя назіранні паказалі, што землятрусы здараюцца часцей, калі хуткасць кручэння Зямлі вакол сваёй восі трохі памяншаецца за кошт унутраных прычын. У XX стагоддзі было выяўлена пяць такіх перыядаў, калі колькасць землятрусаў значна перавышала сярэдняе значэнне. «У гэтыя перыяды бывала 25—30 магутных землятрусаў у год. У астатні час — не больш за 15», — расказаў навуковец Guardian. Свае высновы, апублікаваныя ў часопісе Geophysical Research letters, вучоны прадставіў на нядаўняй канферэнцыі Амерыканскага геалагічнага таварыства.